# НАЦИОНАЛИЗМ И КОНЦЕПЦИЯ ГРАЖДАНСКОГО ОБЩЕСТВА В ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЕ



МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

Юридический факультет

Центр исследования Пограничья

# НАЦИОНАЛИЗМ И КОНЦЕПЦИЯ ГРАЖДАНСКОГО ОБЩЕСТВА В ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЕ

Сборник материалов
Четвертых международных Афанасьевских чтений
«Социальные процессы: восточноевропейский контекст»

Брест, 15–16 декабря 2008 года

Под общей редакцией
доктора исторических наук, профессора
М.Э. Чесновского

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2009

УДК 323.14+316.3/.4(04) (063)
ББК 66.01+60.524(Я43)
Н 35

*Рекомендовано редакционно-издательским советом учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»*

*Редакционная коллегия:*

**О.В. Бреский,** кандидат юридических наук, доцент
**А.Н. Вабищевич,** кандидат исторических наук, доцент
**А.А. Горбацкий,** доктор исторических наук, профессор
**Г.И. Займист,** кандидат философских наук, доцент

*Рецензенты:*
доктор исторических наук, профессор
**В.А. Космач**
доктор политических наук, профессор
**С.В. Решетников**

Н 35 **Национализм** и концепция гражданского общества в Восточной Европе : сб. материалов Четвертых международных Афанасьевских чтений «Социальные процессы: восточноевропейский контекст», Брест, 15–16 декабря 2008 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина ; Центр иссл. Пограничья ; под общ. ред. М.Э. Чесновского ; редкол.: О.В. Бреский [и др.]. – Брест : БрГУ, 2009. – 300 с.
ISBN 978-985-473-500-9.

В сборник вошли материалы, представленные участниками Четвёртых международных Афанасьевских чтений «Социальные процессы: восточноевропейский контекст» на тему «Национализм и концепция гражданского общества в Восточной Европе», в рамках которых был осуществлен обмен научными наработками ученых вузов и научных учреждений Республики Беларусь и Республики Польша по теоретическим и практическим проблемам национализма и гражданского общества в Восточной Европе.

Может быть использован научными сотрудниками, практическим работниками, преподавателями, аспирантами, магистрантами и студентами высших учебных заведений.

Ответственность за подбор и достоверность приведенных фактов, цитат, имен собственных и другой информации несут авторы.

**УДК 323.14+316.3/.4(04) (063)**
**ББК 66.01+60.524(Я43)**

**ISBN 978-985-473-500-9**

© УО «Брестский государственный»
университет имени А.С. Пушкина, 2009

УДК 94(476)

**А.М. Вабішчэвіч**

# ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД У ГАЛІНЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА 1920-х – ПЕРШАЯ ПАЛОВА 1930-х ГАДОЎ)

У адной з папярэдніх публікацый аўтар даследаваў палітыку польскіх улад у галіне культуры і асветы этнічных супольнасцей Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гг. [1]. Мэтай дадзенай публікацыі з'яўляецца аналіз урадавай нацыянальнай палітыкі Польшчы, яе ажыццяўленне ў галіне культуры, асветы беларусаў і іншых этнасаў у заходнебеларускім краі ў вызначаны храналагічны перыяд, які ахоплівае час устанаўлення і функцыянавання ў Польскай дзяржаве рэжыму "санацыі".

Хоць на працягу першай паловы 1920-х гг. у палітыцы польскіх урадаў дамінавала нацыянальна-дэмакратычная канцэпцыя, якая на практыцы знайшла ўвасабленне ў нацыянальнай асіміляцыі беларусаў і іншых славянскіх этнасаў (акрамя палякаў), аднак найперш апазіцыйныя польскія палітычныя сілы прапаноўвалі ўнесці ў яе адпаведныя карэктывы. Такія змены ў напрамку большай прыхільнасці да дзяржаўнай асіміляцыі былі зроблены яшчэ да майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту ў Польшчы. У красавіку 1926 г. міністр унутраных спраў Польшчы У. Рачкевіч падрыхтаваў асобны дырэктыўны дакумент [2, арк. 10–12]. Выкладзеныя ў ім новыя падыходы набылі статус афіцыйных ужо пасля ўсталявання рэжыму "санацыі" Ю. Пілсудскага. У дакладзе, прадстаўленым новым міністрам унутраных спраў К. Младзяноўскім на пасяджэнні ўрада 18 жніўня 1926 г. [3], стратэгічным напрамкам у нацыянальнай палітыцы была абвешчана дзяржаўная асіміляцыя. Менавіта гэты курс "дзяржаўнай інтэграцыі нацыянальных меншасцей" стаў не толькі прапагандавацца, але і ўкараняцца на практыцы [4, с. 397–426]. На наш погляд, адзначаныя карэктывы ўрадавай палітыкі мелі тактычны характар: адбыўся пераход ад гвалтоўных, выразна канфрантацыйных метадаў адносна нацыянальных меншасцей (да іх залічвалі і беларусаў) да памяркоўных, лавіравання. На гэта паўплывала пашырэнне заходнебеларускага руху, асабліва Грамады. Грамадаўскі ўздым разглядаўся польскімі ўладамі выключна праз прызму знешняга (усходняга, г. зн. савецкага) фактару і антыдзяржаўнай дзейнасці [5, с. 81]. У адпаведнасці з новымі падыходамі разам з ганеннямі ажыццяўляліся нязначныя ўступкі ў галіне культуры і асветы. Аднак нават праграма-мінімум, з якой у лістападзе 1926 г. выступіў Л. Васілеўскі

(прапаноўваў пераўтварыць нешматлікія беларускія школы ў дзяржаўныя, аблегчыць падрыхтоўку настаўнікаў, павялічыць допуск беларускіх дзяцей у прафесійныя і сярэднія школы, стварыць кафедру беларусістыкі ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя і дзяржаўную беларускую настаўніцкую семінарыю ў Вільні, аказваць матэрыяльную дапамогу студэнтам-беларусам, выдзяліць субсідыі для беларускіх асветніцкіх, навуковых таварыстваў, выдавецтваў, надрукаваць беларускамоўныя падручнікі і інш.) [6, арк. 36–37], была рэалізавана часткова. Пасля разгрому ў 1927 г. Грамады вырашэнне беларускага пытання было вернута ў русла палітыкі ўрадаў першай паловы 1920-х гг. [7, с. 242]. Яно не ўяўлялася складаным з-за адсутнасці арганізаваных структур беларускага нацыянальнага руху.

Як і папярэднія ўрады эндэкаў, урады “санацыі” выступалі за паланізацыю заходнебеларускіх зямель. Як адзначаў кіраўнік усходняга аддзела Міністэрства замежных спраў Польшчы Т. Галуўка на адным з пасяджэнняў польскага сейму ў пачатку 1931 г., вялікадзяржаўныя інтарэсы дыктавалі ўмацаванне на “крэсах” не толькі польскіх дзяржаўных інтарэсаў, але і польскай культуры [8, с. 175]. Адукацыйная сфера па-ранейшаму з’яўлялася адным з галоўных інструментаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі. У кантэксце палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі ад настаўнікаў і школьнай адміністрацыі патрабавалася навучанне “ў духу, прыхільным для Польшчы і яе дзяржаўнасці”, каб дзецям і іх бацькам даводзілася, што задачай школы з’яўляецца “абуджэнне грамадзянскага і дзяржаўнага пачуцця” [9, с. 46].

У палітычным рэжыме “санацыі” парламенцкія органы перасталі выконваць рашаючыя функцыі, пасіўнасць праяўляў і польскі ўрад [8, с. 129–130]. У дзейнасці польскага сейму ў другой палове 1920-х гг. адсутнічалі сур’ёзныя заканадаўчыя ініцыятывы ў галіне культурна-асветніцкага жыцця. Толькі ў канцы 1920-х гг. украінскія парламентарыі разам з іншымі няпольскімі прадстаўнікамі прапаноўвалі новыя законапраекты ў галіне нацыянальнай асветы [10], аднак польская парламенцкая большасць іх адхіліла.

Нягледзячы на актывізацыю ў другой палове 1920-х гг. дзейнасці Інстытута даследавання нацыянальных спраў, вынікі працы яго супрацоўнікаў (асабліва дырэктара Л. Васілеўскага), а таксама Т. Галуўкі, В. Куманецкага, Е. Асмалоўскага, А. Сцебельскага, Г. Лёвенгерца і іншых палітычных і грамадскіх дзеячаў, вучоных, выкарыстоўваліся выключна для ідэалагічна-прапагандысцкага забеспячэння ўрадавай нацыянальнай палітыкі, а не для выпрацоўкі аптымальных і абгрунтаваных рашэнняў. У Вільні была створана асобная літоўска-беларуская камісія з 5 падсекцыямі (літаратурнай, беларусазнаўства, гістарычнай, дэмаграфічна-статыстычнай,

эканамічнай) [11]. З 1927 г. Інстытут даследавання нацыянальных спраў выдаваў часопіс “Sprawy narodowościowe” (“Нацыянальныя справы”). Распрацоўкі вучоных не знаходзілі належнай падтрымкі з боку цэнтральных і мясцовых органаў улады.

Пасля ўсталявання рэжыму “санацыі” большасць яўрэйскіх партый і арганізацый спадзявалася на змены ў нацыянальнай палітыцы адносна яўрэйскай супольнасці. Хоць кардынальных змен не адбылося, аднак у параўнанні з папярэднімі ўрадамі не праводзілася антысеміцкая прапаганда, якая лічылася дэстабілізуючым фактарам нацыянальна-культурнага, сацыяльна-эканамічнага жыцця [8, с. 237]. На афіцыйным узроўні не былі адхілены прававыя абмежаванні адносна яўрэяў. Для яўрэйскіх школ, якія не атрымалі правоў грамадскіх устаноў, не выдзяляліся сродкі, іх выпускнікі вымушаны былі здаваць экзамены на польскай мове [12; 13]. Асобныя ўступкі на карысць яўрэйскай супольнасці былі зроблены: пасля настойлівых патрабаванняў яўрэйскіх парламентарыяў [14] было адхілена распараджэнне аб абмежаванні колькасці яўрэяў сярод студэнтаў ВНУ (“numerus clausus”); на нявызначаны тэрмін былі прадоўжаны дазволы для ўтрымання існуючых яўрэйскіх школ і аблегчана іх атрыманне для новых устаноў; яўрэйская гімназія ў Вільні атрымала магчымасць здаваць экзамены на іўрыце; было дазволена выкарыстоўваць ідыш і іўрыт пры правядзенні публічных мерапрыемстваў, сходаў [15, с. 47]; быў урэгуляваны прававы статус яўрэйскіх рэлігійных абшчын [16, арк. 1]; аказана матэрыяльная дапамога для яўрэйскіх адукацыйных устаноў. У многім пазітыўнае стаўленне тлумачылася неабходнасцю паляпшэння іміджу польскіх улад за мяжой. Адначасова лагер пілсудчыкаў не перашкаджаў развіццю сіянізму, прыхільна ставіўся да эміграцыі яўрэяў з Польшчы і заходнебеларускіх зямель у прыватнасці.

Адной з важных сацыяльных праблем Заходняй Беларусі з’яўлялася непісьменнасць. Паводле перапісу насельніцтва 1921 г., доля непісьменных у Палескім ваяводстве складала 71%, у Навагрудскім – 54,6%, на Віленшчыне – 58,3% (пры агульнапольскім паказчыку 33,1%). Найбольшая доля непісьменных прыходзілася на сельскую мясцовасць. У прыватнасці, у Навагрудскім ваяводстве доля непісьменных вясковых жыхароў вагалася з 45,8% у Нясвіжскім павеце да 70,2% – у Слонімскім [17, арк. 38адв.–39]. Нягледзячы на дасягнутыя да канца 1920-х гг. поспехі ў ліквідацыі непісьменнасці, праблема ўсеагульнага пачатковага навучання ў заходнебеларускіх землях была далёкай ад вырашэння. У многіх заходнебеларускіх паветах існавалі “бясшкольныя акругі”. Павольна ішло развіццё сеткі польскіх школ у сельскай мясцовасці. Слабым было матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне існуючых пачатковых школ. Пры тых марудных тэмпах ліквідацыі непісьменнасці ў Польшчы (за перыяд паміж

1921 і 1931 гг. – прыкладна на 10%) канчатковае вырашэнне гэтай вострай сацыяльнай праблемы магло зацягнуцца на некалькі дзесяцігоддзяў.

У пачатку 1930-х гг. аўтарытарны рэжым “санацыі” ажыццявіў захады ў бок абмежавання грамадзянскіх правоў і свабод. “Закон аб сходах”, які быў прыняты 11 сакавіка 1932 г., даў адміністрацыйнаму апарату кантрольныя функцыі за грамадскімі арганізацыямі [18]. Асаблівы грамадскі рэзананс атрымала рэформа адукацыі, ініцыятарам якой быў міністр веравызнанняў і грамадскай асветы Я. Янджэевіч. Паводле прынятых 11 сакавіка 1932 г. законаў “Аб арганізацыі школьнай справы” [19], “Аб прыватных школах, навучальных і выхаваўчых установах” [20], была вызначана наступная структура сістэмы адукацыі: усеагульная пачатковая (першая ступень – 4, другая – 6, трэцяя – 7 класаў), агульнаадукацыйная сярэдняя (4 класы гімназіі і 2 – ліцэя), прафесійная і вышэйшая. Пачатковае навучанне дзяцей з 7-гадовага ўзросту было абвешчана абавязковым. Польская дзяржава дэкларавала для ўсіх грамадзян вучобу дзяцей у школах больш высокай ступені. Аднак гарантыі для заходнебеларускага насельніцтва не былі практычна рэалізаваны: усеагульнае пачатковае навучанне не было дасягнута, у вясковай мясцовасці большасць складалі пачатковыя школы 1–2 ступеняў, захоўвалася непісьменнасць. Шматступенчатасць сістэмы адукацыі разам з матэрыяльнай незаможнасцю, перашкодамі польскіх улад істотна абмежавалі доступ заходнебеларускай моладзі да сярэдняй і вышэйшай школы. Яшчэ больш абмежаваліся магчымасці для вучобы ў прафесійных установах – у 1936/1937 навуч. годзе доля беларусаў сярод навучэнцаў там складала 0,5%, палякаў – 83,5% [21, с. 300]. Негатыўныя наступствы адчувалі і прыватныя яўрэйскія школы. Яўрэйскія дзеці вымушаны былі пераходзіць у дзяржаўныя польскія навучальныя ўстановы [22, с. 179].

Нягледзячы на даволі супярэчлівы і незавершаны характар, рэформа адукацыі 1932 г. умацавала арганізацыйныя, вучэбна-метадычныя асновы польскіх школ у Заходняй Беларусі. Новыя праграмы польскіх школ былі больш звязаны з грамадскай практыкай, улічвалі рэгіянальныя і мясцовыя асаблівасці. Аднак стала выразнай палітычна-ідэалагічная накіраванасць працэсу навучання і выхавання [23; 24; 25, с. 105–106]. Яшчэ ў час дыскусіі аб школьнай рэформе разгарэлася палеміка аб прысутнасці культу Ю. Пілсудскага ў выхаваўчым і навучальным працэсе. Польскія школьныя ўлады лічылі, што яго культ з’яўляўся абгрунтаваным і не падлягаў дыскусіі [26, с. 307]. У распрацаваных новых вучэбных праграмах былі адлюстраваны погляды адносна асветы лідэраў лагеру пілсудчыкаў, на першы план узводзілася ідэя польскай дзяржаўнасці, заслугі лагеру пілсудчыкаў ў яе адраджэнні і ўзмацненні. Культ Ю. Пілсудскага насаджваўся і ў пазашкольнай дзейнасці – у тэатральных пастаноўках, на

разнастайных тэматычных выставах, дзе асвятлялася яго грамадска палітычная дзейнасць, вайсковыя паходы і інш.

Асобныя элементы канцэпцыі рэгіяналізму працягвалі фрагментарна выкарыстоўвацца ў палітыцы польскіх улад на тэрыторыі Палескага ваяводства, хоць палескі ваявода Я. Крагельскі спрабаваў строга прытрымлівацца палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі. У цыркуляры ад 22 жніўня 1930 г. ім падвергнуты крытыцы за адмоўнае стаўленне да беларусаў нацыяналістычна настроеныя павятовыя старасты [27, арк. 653]. На канферэнцыі ў Брэсце ў снежні 1931 г. Я Крагельскі таксама падкрэсліваў, што мясцовай адміністрацыі не трэба перашкаджаць развіццю нацыянальнай свядомасці ўкраінцаў і беларусаў. "Рускі элемент", у прыватнасці рускіх-служачых, якім высоўваліся прэтэнзіі аб выкарыстанні рускай мовы, ваяводскія ўлады прызнавалі небяспечным для Польскай дзяржавы [28, арк. 29]. У жніўні 1932 г. палескі ваявода Я. Крагельскі накіраваў міністру ўнутраных спраў Польшчы Б. Перацкаму асобны мемарандум па праблемах Палесся [29, арк. 1–39], у якім палітыка рэпрэсій у адносінах да беларускага руху прызнавалася памылковай. Пры гэтым ваявода лічыў немэтазгодным аказваць дапамогу беларускага руху ў стварэнні нейкіх пляцовак, а адносна ўкраінцаў рэкамендаваў праводзіць палітыку "па лініі істотнага суіснавання, роўнасці грамадзян адзінай краіны" [29, арк. 5]. Па яго меркаванню, пры правядзенні адпаведнай палітыкі колькасць рускіх да наступнага перапісу павінна была значна зменшыцца, абмежавацца толькі нешматлікай групай гарадской інтэлігенцыі [29, арк. 6]. У паланізацыі галоўную ролю адводзіў адукацыйнай сферы: "школа, асабліва грамадская, можа і павінна стаць адным з галоўных фактараў узмацнення польскага насельніцтва" [29, арк. 20]. Прадугледжвалася стварэнне новых бібліятэк; выданне рэгіянальнай прэсы; супрацьдзеянне неауніі і іншыя меры.

Неабходна адзначыць, што З. Бечковіч (у 1926–1931 гг. – навагрудскі ваявода, у 1931–1933 гг. – віленскі ваявода) спрабаваў запазычыць для практычнай рэалізацыі асобныя элементы з рэгіянальнага "валынскага праекта" ці "валынскага эксперымента" ваяводы Г. Юзэфскага, які таксама ажыццяўляўся ў рамках палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі і быў накіраваны на прывіццё ўкраінцам Валыні пачуцця прыналежнасці да Польскай дзяржавы [30, с. 15; 31; 32]. Канцэпцыя рэгіяналізму была выгаднай рэжыму "санацыі", бо адцягвала ўвагу ад існавання асобных нацыянальных супольнасцей (беларусаў, украінцаў, літоўцаў) [33].

Праведзены аналіз палітыкі польскіх улад у галіне нацыянальна-культурнага жыцця ў акрэслены храналагічны перыяд дае падставы зрабіць шэраг высноў. Па-першае, планы і дзеянні ўрадавых колаў і мясцовай адміністрацыі ў галіне культуры, адукацыі цесна прывязваліся да

нацыянальнай палітыкі Польскай дзяржавы. Па-другое, прадэклараваныя рэжымам "санацыі" змены ў нацыянальнай палітыцы (замест палітыкі нацыянальнай асіміляцыі – палітыка дзяржаўнай асіміляцыі) сведчылі аб адыходзе ад папярэдняй нацыянальна-дэмакратычнай мадэлі ў бок канцэпцый, якія прапаноўвалі ліберальна-дэмакратычныя колы і польскія сацыялісты. Аднак санацыйныя ўлады выкарысталі толькі асобныя элементы гэтых канцэпцый. Змены ў нацыянальнай палітыцы не мелі кардынальнага, сутнаснага характару, адрозніваліся больш метадамі яе правядзення. Пад уплывам шэрагу фактараў з канца 1920-х гг. фактычна адбылося вяртанне да папярэдняй мадэлі эндэкаў. Канфрантацыйнага характару нацыянальна-культурных інтарэсаў палякаў, як тытульнага этнаса ў Польскай дзяржаве, і беларусаў, як большасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, пераадолець не ўдалося. У грамадскай свядомасці польскай супольнасці працягваў складвацца комплекс непрыняцця беларускага руху як штучнага, інспіраванага з усходу. Праўда, і зараз некаторыя даследчыкі (не толькі польскія, але і расійскія [34]) спрабуюць перакласці адказнасць за канфлікт на ўсіх суб'ектаў нацыянальна-культурнага жыцця (г. зн. і на беларусаў), што з'яўляецца неадпавядаючым гістарычнай ісціне. Па-трэцяе, пры выкарыстанні элементаў канцэпцыі рэгіяналізму (асабліва на Палессі) былі ўлічаны мясцовыя асаблівасці, аднак польская адміністрацыя свае дзеянні ажыццяўляла ў рамках афіцыйнай урадавай палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ


1. Вабішчэвіч, А.М. Палітыка польскіх улад у галіне культуры і асветы этнічных супольнасцей Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гадоў / А.М. Вабішчэвіч // Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўплывы: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель, 9–10 кастрычніка 2008 г. / ГДУ імя Ф. Скарыны; рэдкал.: Р.Р. Лазько (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2008. – С. 296–304.
2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1087. Цыркуляры палескага ваяводы, указанні МУС аб прынцыпах нацыянальнай палітыкі і іншых пытаннях (20.10.1925 г. – 29.07.1927 г.).
3. Madajczyk, C. Dokumenty w sprawie polityki narodowościowej władz polskich po przewrocie majowym / C. Madajczyk // Dzieje najnowsze. – 1972. – № 3. – S. 137–169.
4. Paruch, W. Myśl polityczna obozu piłsudczykowskiego 1926–1939 / W. Paruch. – Lublin : Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2005. – 880 s.

5. Wróbel, P. Kształtowanie się białoruskiej świadomości narodowej a Polska / P. Wróbel // Prace Instytutu historycznego Uniwersytetu Warszawskiego. Warszawa : Wyd-wo Uniwersytetu Warszawskiego, 1990. – № 15. – C. 1–109.
6. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zespół 390. Akta Leona Wasilewskiego (1890–1936(1937)). – Sygnatura 77. Экспертная камісія па справах нацыянальных меншасцей. Мемарыялы, карэспандэнцыя, выгрымкі прэсы (1924–1928).
7. Chojnowski, A. Koncepcje polityki narodowościowej rządow polskich w latach 1921–1939 / A. Chojnowski. – Wrocław-Warszawa-Kraków : Ossolineum, 1979. – 262 s.
8. Paruch, W. Od konsolidacji państwowej do konsolidacji narodowej. Mniejszości narodowe w myśli politycznej obozu piłsudczykowskiego (1926–1939) / W. Paruch. – Lublin : Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 1997. – 424 s.
9. Zadania administracji szkolnej na ziemiach wschodnich // Sprawy narodowościowe. – 1927. – № 1. – S. 45–46.
10. Wnioski ustawodawcze w sprawie szkolnictwa mniejszościowego // Sprawy narodowościowe. – 1929. – № 1. – S. 66–76.
11. Sprawy narodowościowe. – 1927. – № 3. – S. 328.
12. Pismo Klubu posłów i senatorów Żydowskiej Rady Narodowej do Marszałka Piłsudskiego // Nasz przegląd. – 1927. – 22 listopada.
13. Rząd uważa Żydów za mniejszość narodową drugiej kategorii // Nasz przegląd. – 1927. – 3 stycznia.
14. Memoriał Żydowskiej Rady Narodowej w sprawie "numerus clausus" // Natio. – 1927. – № 6. – S. 90–92.
15. Język żydowski na zgromadzeniach publicznych // Sprawy narodowościowe. – 1927. – № 1–2. – S. 46–47.
16. Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas (LCVA). – F. 51. – Ap. 1. – B 11. Справа арганізацыі і дзейнасці яўрэйскіх гмін (1925 г.).
17. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1281. Месячныя справаздачы павятовых старастаў Палескага ваяводскага ўпраўлення аб дзейнасці польскіх палітычных партый, грамадскіх арганізацый, рэлігійным руху, рэферат аб грамадска-палітычным і культурным жыцці насельніцтва Навагрудскага ваяводства (2.10.1937–21.12.1937 г.).
18. Ustawa z dnia 11 marca 1932 roku o zgromadzeniach // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1932. – № 48. – Poz. 450.
19. Ustawa o ustroju szkolnictwa z dnia 11 marca 1932 r. // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1932. – № 38. – Poz. 389.
20. Ustawa o prywatnych szkołach oraz zakładach naukowych i wychowawczych z dnia 11 marca 1932 r. // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1932. – № 33. – Poz. 343.



21. Miąso, J. Szkoły zawodowe w Polsce w latach 1918–1939, ich rozwój, organizacja i funkcje społeczne / J. Miąso. – Wrocław-Warsawa-Kraków : Ossolineum, 1988. – 303 s.
22. Wasiluk, J. Szkolnictwo żydowskie w Drugiej Rzeczypospolitej / J. Wasiluk // Pogranicze. Studia społeczne. – Białystok : Pracownia Poligraficzna Działu Wydawnictw Filii UW w Białymstoku, 1993. – T. 3. – S. 163–183.
23. Pannenkowa, I. Co to jest wychowanie państwowe / I. Pannenkowa. – Warszawa : Dom Książki polskiej, 1932. – 32 s.
24. Czerwiński, S. Konstytucja państwa a wychowanie publiczne: przemowa wygłoszona dnia 28 listopada 1929 r. w Wilnie / S. Czerwiński. – Warszawa : Liga Rozwoju Mocarstwowego Polski, 1929. – 24 s.
25. Garbowska, W. Szkolnictwo powszechne w Polsce w latach 1932–1939 / W. Garbowska. – Wroclaw-Warszawa-Kraków-Gdańsk : Wydawnictwo PAN, 1976. – 204 s.
26. Cichoracki, P. Legenda i polityka: Kształtowanie się wizerunku Marszałka Józefa Piłsudskiego w świadomości zbiorowej spoleczeństwa polskiego w latach 1918–1939 / P. Cichoracki. – Kraków: Księgarnia akademicka, 2005. – 411 s.
27. ДАБВ. – Ф. 67. – Воп. 2. – Спр. 1. Цыркуляр МУС аб урэгуляванні работы ваяводскага і павятовага камітэтаў фізічнай падрыхтоўкі і ваеннага навучання (18.11.1929 г.).
28. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 909. Даклад начальніка грамадска-палітычнага аддзела Палескага ваяводскага ўпраўлення аб размяшчэнні і грамадска-палітычным жыцці рускіх на Палессі (19.09.–27.10.1936 г.).
29. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 2253. Мемарандум палескага ваяводы аб эканамічным, грамадска-палітычным, культурным, нацыянальным становішчы Палесся (1932 г.).
30. Крамар, Ю.В. Политика государственной ассимиляции на Волыни (1928–1938 года): автореф. дис... канд. іст. наук: 07.00.02 / Ю.В. Крамар; НАН України, Ін-т українознав. ім. І. Крип'якевича. – Львів, 1998. – 18 с.
31. Kuczerepa, M. Polityka II Rzeczypospolitej wobec ukraińców na Wołyniu w latach 1921–1939 / M. Kuczerepa // Przegląd Wschodni: historia i współczesnosć polaków na wschodze. – 1997. – T. IV. – Z. 1. – S. 139–154.
32. Potocki, R. Polityka państwa polskiego wobec zagadnienia ukraińskiego w latach 1930–1939 / R. Potocki. – Lublin : Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, 2003. – 441 s.
33. Этнаграфічная маса-рэгіяналізм-свабода адзінак (Тры этапы польскай палітыкі адносна нацыянальных меншасцяў // Беларуская крыніца. – 1932. – № 12. – 20 сакавіка.
34. Черных, М.Н. Проблемы во взаимоотношениях поляков с национальными меньшинствами в межвоенной Польше. – Режим доступа : http://rossia.org/dossier/balkans/pol-minor.htm. – Дата доступа : 22.08.2007.